УДК 81’374

Студ. К. В. Багдановіч
Навук. кір. канд. філал. навук У. І. Куліковіч
(кафедра рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій, БДТУ)

# КАНЦЭПЦЫЯ СТВАРЭННЯ СЛОЎНІКА АСАБОВЫХ НАЙМЕННЯЎ

**Уводзіны.** Слоўнікі змяшччюць словы, марфемы, словазлучэнні, ідыёмы і г. д. па вызначаным прынцыпу, даюць звесткі пра іх значэнне, ўжыванне, паходжанне, пераклад на іншыя мовы.

Актуальнасць: агульная функцыя слоўнікаў — фіксацыя, сістэматызацыя, назапашванне і захоўванне ведаў аб свеце і нацыянальнай мове, перадача гэтых ведаў ад пакалення да пакалення. Дзякуючы слоўніку, чалавек паляпшае сваё валоданне мовай, пазнае сутнасць рэчаў, якія знаходзяцца вакол яго.

У Беларусі стварэннем слоўнікаў займаюцца выдавецтвы “Беларуская энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі”, “Аверсэв”, “Тэхналогія”, выдавецкі дом “Беларуская навука” і іншыя.

Сёння слоўнікі досыць запатрабаваны, згодна з электронным каталогам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, за апошнія 20 гадоў было выпушчана 1411 слоўнікаў. Сярод іх энцыклапедычныя слоўнікі і лінгвістычныя слоўнікі розных жанраў: слоўнікі мовы пісьменнікаў, тэрміналагічныя, перакладныя, граматычныя і фразеалагічныя, гістарычныя і этымалагічныя слоўнікі.

Але, на жаль, сярод беларускіх справачных выданняў няма слоўнікаў, якія былі б цалкам прысвечаны асабовым назоўнікам, нягледзячы на тое, што ў беларускай лінгвістыцы маецца шмат прац, прысвечаных асабовым намінацыям: Н. Архіпава [1], В. Грыб [2], Д. Кананенка [3] і іншыя. Спробу скласці слоўнічак асабовых жаночых намінацый здзейсніў у 2016 г. У. Гарбацкі [4].

Слоўнік асабовых найменняў будзе садзейнічаць разуменню гісторыі народа, самасвядомасці беларусаў, вывучэнню прафесій і інш.

Мэта даследавання — распрацаваць канцэпцыю слоўніка асабовых найменняў, на стварэнне якога выдзелены грант Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2019 г.

Канцэпцыя канкрэтызуе тыпалагічныя параметры меркаванага выдання, выразна і поўна раскрывае яго задуму, задачы, агульныя прынцыпы падбору і арганізацыі матэрыялу.

Яна павінна быць распрацавана ў дастатковай ступені і ўключаць рэальныя і дакладныя параметры, якія, б ўзгадняліся адзін з адным. Канцэпцыя павінна быць канкрэтнай, прывязанай да рэальных чытацкіх патрабаванняў, да сітуацыі на кніжным рынку, улічваць эканамічныя і іншыя магчымасці выдавецтва.

Канцэпцыя выдання становіцца асновай рэдактарскай падрыхтоўкі слоўніка; дэталізацыя параметраў выдання на этапе яго праектавання дазваляе рэдактару прымаць узважаныя і абгрунтаваныя рашэнні на ўсіх этапах сваёй працы. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне мае веданне рэдактарам тыпалагічных асаблівасцяў слоўніка.

**Асноўная частка.** Канцэпцыя слоўніка складаецца з планавання яго назвы, аб’ёму, структуры слоўнікавага артыкула, размяшчэння матэрыялу, даведачнага апарату.

1. Назва слоўніка. Прапануецца: “Людзі і назвы: слоўнік асабовых найменняў”. Першая частка “Людзі і назвы” можа быць падавацца як скарочаны варыянт. Частка “слоўнік асабовых найменняў” тлумачыць папярэднюю і дапамагае зразумець змест выдання больш дакладна.

2. Аб’ём слоўніка. Згодна з вынікамі аналізу “Вялікалітоўска-рускага слоўніка” Я. Станкевіча [5], на кожную літару беларускага алфавіта прыходзіцца каля 200 асабовых назоўнікаў. Значыць, слоўнік будзе змяшчаць прыкладна 6 000 слоў. Гэтая інфармацыя стане больш дакладнай, калі будзе праведзены адбор лексем для слоўніка.

3. Структура слоўнікавага артыкула. Артыкул будзе ўключаць граматычныя звесткі пра слова, стылістычныя паметы, лексічнае значэнне слова, прыклады ўжывання слова і яго гісторыю. Да многіх слоў будуць пададзены фотаздымкі і малюнкі. Таксама неабходна ўказанне націску, выдзяленне ў шматзначных словах кожнага значэння арабскімі лічбамі. Артыкул будзе змяшчаць не больш за пяцьсот знакаў.

4. Размяшчэнне матэрыялу. Словы павінны падавацца ў алфавітным парадку. Названы прынцып з’яўляецца найбольш зручным для хуткага пошуку патрэбнай лексемы. Акрамя алфавітнага, існуюць гнездавы і тэматычны прынцыпы размяшчэння слоў, але яны рэдка выкарыстоўваюцца і не з’яўляюцца звыклымі для чытачоў, таму карыстацца імі будзе складаней.

5. Даведачны апарат. Слоўнік будзе змяшчаць

- прадмову, дзе карыстальніку слоўнікам патлумачыцца, якая ў слоўніка мэта, якую карысць ён прынясе чытачу, чым гэты слоўнік

адрозніваецца ад іншых, будзе пададзена інфармацыя пра тых, хто складаў гэты слоўнік і хто займаўся вёрсткай, дызайнам і ілюстрацыямі;

- звесткі для карыстання слоўнікам, у якіх будуць апісвацца асаблівасці складу слоўніка, правільнага пошуку патрэбнай інфармацыі ў ім;
- спіс скарачэнняў, які дапаможа даведацца значэнне скарочаных граматычных і стылістычных памет;
- бібліяграфію, дзе будуць указаны крыніцы слоў і інфармацыі пра іх;
- беларускі алфавіт, каб карыстальніку было лягчэй ўспрыняць структуру слоўніка і знайсці патрэбнае слова;
- алфавітны і прадметна-імянны паказальнікі, каб чалавек мог хутчэй арыентавацца па словах.

Акрамя гэтага, абавязковымі элементамі даведачнага апарату з'яўляецца анатацыя, выхадныя і выпускныя звесткі.

**Заключэнне.** Распрацаваная канцэпцыя выдання "Людзі і назвы: слоўнік асабовых найменняў" стане асновай яго рэдактарскай падрыхтоўкі. Удакладненне галоўных параметраў выдання на этапе яго праектавання дазволіць рэдактару прымаць абгрунтаваныя рашэнні на ўсіх этапах працы.

ЛІТАРАТУРА

1. Архіпава, Н. Найменні асобы ў сучаснай беларускай мове / Н. Архіпава / "Мова — літаратура — культура": матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 16–17 ліст. 2006 г. / Беларускі дзярж. ун-т. — Мінск, 2007. — С. 366–369.

2. Грыб, В. Назоўнікі са значэннем асобы па нацыянальнай і этнічнай прыналежнасці ў сучаснай беларускай мове / В. Грыб / "Мова — літаратура — культура": матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 16–17 ліст. 2006 г. / Беларускі дзярж. ун-т; у аўтарскай рэдакцыі. — Мінск: Права і эканоміка, 2007. — С. 373–376.

3. Кананенка, Д. А. Асабовыя назоўнікі нямецкага паходжання ў мове беларускай мастацкай прозы / Д. А. Кананенка // Веснік Віцебскага дзярж. ун-та. —2007.— № 4 (46).— С. 111–117.

4. Гарбацкі, У. Гід па фэмінізацыі беларускай мовы (Nomina-agentis і некаторых іншых асабовых намінацый) / У. Гарбацкі. — Вільня: Выдавец І. Іваноў, 2016. — 144 с.

5. Др. Я. Станкевіч. Беларуска-расейскі (Вялікалітоўска-расейскі) слоўнік. Byelorussian-Russian (Greatlitvan-Russian) Dictionary by Dr. J. Stankevich — Published by: Lew Sapieha Greatlitvan (Byelorussian) Foundation, New York.— 1305 с.

УДК 659.125.6

Студ. Д. Ф. Когут, В. В. Прусевич
Науч. рук. доц. Ю. Ф. Шпаковский
(кафедра редакционно-издательских технологий, БГТУ)

## РАЗРАБОТКА ИНТЕРАКТИВНОЙ ИНФОГРАФИКИ НА ОСНОВЕ БАЗЫ ДАННЫХ О ПЕРВОКУРСНИКАХ ФАКУЛЬТЕТА ПиМ

Постоянно мы сталкиваемся с такой трактовкой инфографики как «картинка, на которой есть изображение и текст». Данная трактовка слишком обобщена, и, получается, что любое графическое изображение можно отнести к инфографике, что таковым не является. Существует несколько определений понятия «инфографика», исходя из которых можно сделать вывод, что инфографика — это визуальный способ передачи любого вида информации (цифровой, графической и вербальной), смысл которой остается понятен без использования текста.

Инфографику можно классифицировать на интерактивную (анимационная графика) и статическую (одиночные слайды в виде иллюстраций, графиков, таблиц, карт, матриц и алгоритмов).

В данной работе будет рассмотрена и создана интерактивная инфографика на основе программы Tableau.

Интерактивная инфографика — это отображение графической информации, которое позволяет в онлайн-режиме собирать и изменять свои данные в Интернете.

В настоящее время программа Tableau имеет достаточно широко использование. Это вызвано тем, что данная программа быстро анализирует собранные данные, что является один из главных преимуществ. Кроме того, визуализации создаются в виде инструментальных панелей и рабочих листов. Продукты Tableau работают в виртуальных средах, когда они настроены с соответствующей базовой операционной системой и оборудованием. Tableau помогает людям преобразовывать данные в действенные идеи. Подходит для анализа любых данных.

Преимущества Tableau:

1) быстрый анализ данных,

2) анализ в реальном времени,